

V Навукова-краязнаўчая канферэнцыя

# БЕЛАВЕЖЖА: МІНУЛАЕ І СУЧАСНАСЦЬ

## Зборнік дакладаў

Музей-сядзіба "Пружанскі палацык"
23 снежня 2016 года

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

Аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Пружанскага райвыканкама

Музей-сядзіба "Пружанскі палацык"

V НАВУКОВА-КРАЯЗНАЎЧАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

# «Белавежжа: мінулае і сучаснасць»

## Зборнік дакладаў

*23 снежня 2016 г.*

Брэст 2016

УДК 94(476)
ББК 63.3(4 Беи)

**Рэцэнзенты:**

***Вабішчэвіч Аляксандр Мікалаевіч**, доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі славянскіх народаў гістарычнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна.*

***Арцёменка Сяргей Віталевіч**, кандыдат геаграфічных навук, дацэнт кафедры турызму і краіназнаўства геаграфічнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна.*

**Навуковы камітэт:**

**Старшыня:**

***Вабішчэвіч Аляксандр Мікалаевіч**, доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі славянскіх народаў гістарычнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна.*

**Сустаршыня:**

***Зялевіч Юрый Сяргеевіч**, дырэктар музея-сядзібы "Пружанскі палацык".*

**Адказны сакратар:**

***Пракаповіч Наталля Сяргееўна**, галоўны захавальнік фондаў музея-сядзібы "Пружанскі палацык".*

**Члены камісіі:**

***Абрамава Ірына Васільеўна**, кандыдат біялагічных навук, дацэнт, дэкан геаграфічнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна.*

***Дзямідаў Сяргей Юр'евіч**, кандыдат гістарычных навук, галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Пружанскага раённага выканаўчага камітэта.*

Б43 **V Навукова-краязнаўчая канферэнцыя "Белавежжа: мінулае і сучаснасць". – Брэст: Выдавецтва БрДзТУ, 2016. – 116 с.**

**ISBN 978-985-493-387-0**

Даклады навукова-краязнаўчай канферэнцыі прысвечаны рэгіёну Белавежскай пушчы. Разлядаецца шэраг актуальных пытанняў.

Зборнік прадстаўляе цікавасць для выкладчыкаў і настаўнікаў геаграфі, біялогіі і гісторыіі, студэнтаў і ўсіх, хто цікавіцца развіццём Белавежжа.

**На вокладцы:** Шышкін І.І. «Корабельная роща» (1898)

УДК 94(476)
ББК 63.3(4 Беи)

ISBN 978-985-493-387-0

© Музей-сядзіба"Пружанскі палацык", 2016
© Выдавецтва БрДзТУ, 2016

УДК 94(476)
ББК 63.3(4Беи)61

*А.М. Вабішчэвіч (г. Брэст)*

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАВЕЖСКАГА РЭГІЁНУ Ў 1920–1930-я гг.: АГЛЯД КРЫНІЦ (ПАВОДЛЕ ФОНДАЎ ДЗЯРЖАЎНАГА АРХІВА БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ)

У перыяд паміж Першай і Другой сусветнымі войнамі Белавежскі рэгіён уваходзіў у склад Польскай дзяржавы. У межах Палескага ваяводства знаходзіліся Брэсцкі павет з цэнтрам у Брэст-Літоўску (з 20 сакавіка 1923 г. – Брэст над Бугам), Косаўскі павет (з 1 красавіка 1935 г. – Івацэвіцкі павет) з цэнтрам у Косаве (з 1935 г. – у Івацэвічах), Пружанскі павет з цэнтрам у Пружанах (з яго складу 1 студзеня 1926 г. была перададзена Кобрынскаму павету гміна Мацясы, 26 ліпеня 1926 г. атрымана гміна Сухопаль з Бельскага павета Беластоцкага ваяводства, 12 красавіка 1928 г. атрымана частка ліквідаванай гміны Дворцы Брэсцкага павета). Частка тэрыторыі Белавежскага рэгіёну ўваходзіла ў Беластоцкае ваяводства: Белавежскі павет (1920–1922 гг.), цэнтр – мястэчка Белавежа (1 жніўня 1922 г. Белавежскі павет быў ліквідаваны і ўключаны ў склад Бельскага павета), Бельскі павет з цэнтрам у Бельску Падляшскім, Ваўкавыскі павет з цэнтрам у Ваўкавыску, Саколкаўскі павет, цэнтрам якога было мястэчка Саколка.

У цяперашні час у Беларусі значны масіў дакументальных матэрыялаў па гісторыі названых адміністрацыйных адзінак Белавежскага рэгіёну міжваеннага часу, якія ўваходзілі ў Палескае ваяводства, знаходзіцца ў Дзяржаўным архіве Брэсцкай вобласці (ДАБВ, г. Брэст). Многія з фондаў вылучаюцца шматлікасцю і разнастайнасцю змешчаных у іх дакументаў, пераважна польскамоўных[1]. У фондзе 493 "Окружные избирательные комиссии по выборам в Сейм и Сенат Польши созывов 1922, 1928, 1930, 1935, 1938 гг. по Полесскому воеводству" утрымліваюцца дакументы аб правядзенні выбарчых кампаній, удзеле у іх жыхароў Белавежскага рэгіёну. У вопісе 2 гэтага фонда утрымліваюцца матэрыялы акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Сейм і Сенат Польшчы (склікання 1928 г.) выбарчай акруг № 59, (г. Брэст) – цыркуляры генеральнага камісара па выбарах, пратаколы пасяджэнняў участковых выбарчых камісій Брэсцкага, Драгічынскага, Камень-Кашырскага, Кобрынскага, Косаўскага, Пружанскага паветаў, спісы выбаршчыкаў і інш. У вопісе 4 дакументы той жа акруговай выбарчай камісіі – па выбарах у Сейм Польшчы (склікання 1930 г.) – распараджэнні Прэзідэнта Польшчы, цыркуляры, інструкцыі, указанні міністэрства ўнутраных спраў Польшчы, палескага ваяводы, акруговай выбарчай камісіі, спісы і звесткі аб кандыдатах у дэпутаты, пратаколы пасяджэнняў камісіі, рашэнні і спісы членаў участковых выбарчых камісій, папярэднія вынікі галасавання па выбарчай акрузе, спісы выбаршчыкаў названых ужо паветаў. У вопісе

[1] Агляд фондаў ДАБВ праведзены на падставе даведніка, падрыхтаванага аўтарам артыкула ў рамках сумеснага польска-беларускага праекта "Польшча-Беларусь": Polska-Białoruś. Wspólne dziedzictwo historyczne: przewodnik po materiałach archiwalnych 1918–1939. – Tom 1: Archiwum Państwowe Obwodu Brzeskiego, Archiwum Państwowe Obwodu Grodzieńskiego / oprac. i red. nauk.: E. Rosowska, A. Smalianczuk, A. Wabiszczewicz, A. Wielikij. – Warszawa: AMALKER, 2013. – 361 s.

8 акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Сейм і Сенат Польшчы (склікання 1938 г.) выбарчай акругі № 53, (г. Брэст) змешчаны цыркуляры, пратаколы пасяджэнняў участковых выбарчых камісій, сходаў выбаршчыкаў, спісы выбаршчыкаў Брэста, Брэсцкага і Пружанскага паветаў. У вопісе 11 той жа акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Сейм і Сенат Польшчы (склікання 1935 г.) утрымліваюцца таксама спісы выбаршчыкаў Брэста, Брэсцкага і Пружанскага паветаў.

Разнастайныя дакументы аб грамадска-палітычнай сітуацыі, сацыяльна-эканамічным становішчы, культурным і рэлігійным жыцці Белавежскага рэгіёну можна знайсці ў ДАБВ у фондзе 1 “Полесское воеводское управление”. Яны раскіданы па ўсіх вопісах фонда, змешчаны сярод матэрыялаў усіх рэфератаў Палескага ваяводскага ўпраўлення. Там можна знайсці звесткі аб стане сельскай гаспадаркі, наглядзе за лясамі, дзейнасці прамысловых прадпрыемстваў і гандлёвых устаноў, прызыве ў польскую армію, дзейнасці палітычных партый і грамадскіх арганізацый, канфесійным жыцці і інш.

Фонд 4 “Пружанское поветовое староство” у ДАБВ змяшчае 78 спраў за 1922–1939 гг. Сярод іх цыркуляры і распараджэнні Палескага ваяводскага ўраўлення і Пружанскага павятовага староства, справаздачы аб грамадска-палітычным руху ў Пружанскім павеце, дзейнасці камуністаў, польскіх, беларускіх, украінскіх палітычных партый і арганізацый, матэрыялы аб дзейнасці грамадскіх арганізацый, добраахвотных таварыстваў, аб правядзенні выбараў у Сейм і Сенат Польшчы, органы мясцовага самакіравання, аб выдачы пазыкі на аднаўленне гаспадаркі, аб куплі-продажы зямлі, аб прызыве ў польскую армію, эміграцыі жыхароў павета за мяжу, звесткі аб колькасці насельніцтва, аб дазволе на адкрыццё гандлёвых устаноў (крамаў, рэстаранаў, закусачных), спісы прамысловых прадпрыемстваў Пружанскага павета, аб правядзенні меліярацыі. Там жа знаходзяцца асабовыя справы служачых, павятовага ўрача, уліковыя карткі прызыўнікоў, кнігі ўліку дапрызыўнікоў, спісы насельніцтва гмін, ваеннаабавязаных, прызыўнікоў, дыплом ганаровага грамадзяніна Пружанаў павятовага старасты Ч. Зберoньскага (1937 г.), спісы прамысловых прадпрыемстваў, праекты планаў будаўніцтва гандлёвых устаноў.

З іншых фондаў ДАБВ больш ёмістым з’яўляецца фонд 6 “Пружанское городское управление (1920–1933 гг. – Пружанский магистрат) – 1765 адзінак захавання ў 3-х вопісах. У складзе гэтага фонда захоўваюцца пратаколы пасяджэнняў гарадской рады і магістрата, бюджэты і справаздачы аб іх выкананні, аб правядзенні выбараў у Сейм, Сенат Польшчы, матэрыялы аб спагнанні падаткаў з насельніцтва, стане прамысловых прадпрыемстваў, прызыве ў польскую армію, выдачы грамадзянам пашпартоў, будаўніцтве і рамонце школ, дарог, мастоў, правядзенні меліярацыі, санітарным стане, дзейнасці лячэбных устаноў, ветэрынарным абслугоўванні ў горадзе, аб эміграцыі жыхароў у Германію і іншыя краіны, звесткі аб цэнах на прадукты харчавання і тавары, справы аб устанаўленні правоў валодання і апекі над нерухомай маёмасцю жыхароў г. Пружаны, статыстычныя звесткі аб руху насельніцтва, дамавыя кнігі жыхароў горада (па вуліцах і дамах). Ёсць там асабовыя справы служачых і работнікаў магістрата (гарадскога ўпраўлення), спісы выбаршчыкаў, прызыўнікоў, дамавыя кнігі жыхароў г. Пружаны.

Менш захаванымі з'яўляюцца дакументы гарадскога ўпраўлення (магістрата) Камянца – фонд 9 "Каменец-Литовское городское управление (Каменец-Литовский магистрат)" – усяго 24 справы. Сярод іх трэба адзначыць пратаколы пасяджэнняў гарадской рады і гарадскога ўпраўлення, бюджэты і справаздачы аб іх выкананні, звесткі аб стане камунальнай гаспадаркі, заявы грамадзян на выдачу ім пашпартоў, пазыкі, картаграфічны план вуліцы Брэсцкай у г. Камянец-Літоўску, уліковыя карткі ветэрынарных урачоў.

Вялікая інфармацыя аб стане сацыяльнай сферы, меліярацыі, будаўніцтве і рамонце дарог, мастоў, дамоў і іншых пабудоў, пажарнай ахове і інш. утрымліваецца ў фондзе 49 "Брестский поветовый отдел поветовой рады (да 1933 г. – поветовый отдел Брестского сеймика)". Там ёсць асабовыя справы і спісы служачых павятовага аддзела, членаў Высока-Літоўскага магістрата, спісы солтысаў гмін і іх намеснікаў, дзяцей прытулкаў, жыхароў гмін Брэсцкага павета, выбаршчыкаў і кандыдатаў у дэпутаты Брэсцкага сейміка, беспрацоўных, планы і апісанні дарог, мастоў, спісы маёнткаў Брэсцкага павета.

Для даследчыкаў цікавасць уяўляюць дакументы гмінных праўленняў, якія захоўваюцца ў ДАБВ. Так, у фондзе 11 "Правление Волчинской гмины Брестского повета" утрымліваецца 95 адзінак захавання – пратаколы пасяджэнняў гміннага праўлення, выбарчых камісій, бюджэты гміны і справаздачы аб іх выкананні, пратаколы сходаў сялян, статыстычныя звесткі аб колькасці насельніцтва, сялянскіх гаспадарак, памерах пасяўных плошчаў, школ, звесткі аб гаспадарчых і грамадскіх арганізацыях на тэрыторыі гміны, аб паступленні падаткаў, аб правядзенні парцэляцыі зямель, аб будаўніцтве школ, рамонце дарог, помнікаў і інш. У фондзе 12 "Правление Высоко-Литовской гмины Брестского повета" – 83 справы, у фондзе 14 "Правление Верховичской гмины Брестского повета" – 153 справы, у фондзе 16 "Правление Каменец-Литовской гмины Брестского повета" – 59 спраў.

Аб'яднаны фонд 28 "Гминные правления Пружанского повета" (225 адзінак захоўвання) быў створаны ў 1992 г. з дакументаў 18 малааб'ёмных фондаў гмінных праўленняў Пружанскага павета. У яго склад уваходзяць цыркуляры міністэрства ўнутраных спраў Польшчы, распараджэнні Пружанскага павятовага староства, пратаколы пасяджэнняў праўленняў і рад гмінаў, выбарчых камісій, бюджэты гмінных праўленняў і справаздачы аб іх выкананні, перапіска з Пружанскім павятовым староствам па адміністрацыйна-гаспадарчых пытаннях, звесткі аб правядзенні выбараў у Сейм II Рэчы Паспалітай, аб падаткаабкладанні насельніцтва, аб прызыве ў польскую армію, аб будаўніцтве і рамонце школ, дарог, мастоў, аб санітарным стане гмін і барацьбе з інфекцыйнымі захворваннямі, даведкі і пасведчанні аб матэрыяльным становішчы грамадзян, статыстычныя звесткі аб колькасці насельніцтва, памерах пасяўных плошчаў, наяўнасці ў гаспадарках зямлі, жывёлы, інвентару.

Акрамя таго, у ДАБВ існуе яшчэ некалькі асобных фондаў гмінных праўленняў Пружанскага павета. У 37 фондзе ГАБО "Правление Пружанской гмины Пружанского повета" (222 справы) змешчаны цыркуляры міністэрства ўнутраных спраў Польшчы, распараджэнні Пружанскага павятовага староства, пратаколы пасяджэнняў гміннай рады, выбарчых камісій па выбарах солтысаў, бюджэты гміннага праўлення і справаздачы аб іх выкананні, звесткі аб правядзенні выбараў у Сейм і Сенат Польшчы, перапіска і справаздачы аб будаўніцтве і рамонце дарог і

школ, звесткі аб меліярацыі, правядзенні парцэляцыі маёнткаў, кнігі ўліку паступлення падаткаў, статыстычныя звесткі аб нацыянальным складзе насельніцтва гміны (1931 г.), наяўнасці ў гаспадарках гміны жывёлы і сельгастэхнікі, заявы грамадзян аб атрыманні пазыкі на будаўніцтва і куплю зямлі. Там ёсць дакументы па асабоваму складу гміннага праўлення, спісы і картатэка на жыхароў гміны, спісы і анкеты солтысаў, настаўнікаў, спісы ўладальнікаў прадпрыемстваў г. Пружаны, уладальнікаў матацыклаў і веласіпедаў, прызыўнікоў. Інтарэс для даследчыкаў уяўляюць фонд 36 "Правление Линовской гмины Пружанского повета" (83 справы), фонд 34 "Правление Малечской гмины Пружанского повета" (171 справа), фонд 32 "Правление Рудниковской гмины Пружанского повета" (171 справа). У ДАБВ у 1992 г. быў створаны аб'яднаны архіўны фонд з дакументаў гмінных праўленняў Косаўскага павета – фонд 318 "Гминные правления Коссовского повета" (64 справы).

Значныя масівы крыніц, якія пакуль яшчэ слаба ўведзены ў навуковы абарот, захоўваюцца ў фондах польскіх органаў паліцыі, судоў і іншых устаноў. У фондзе 73 "Пружанский городской суд (да 1928 г. – Пружанский мировой суд 3-го округа Пинского окружного суда)" знаходзіцца цяпер 545 адзінак захоўвання – справы па абвінавачванні ў збіцці, абразе прадстаўнікоў польскай улады, войска, духавенства, у крадзяжах і прысваенні чужой уласнасці, у парушэнні ўстаноўленых правілаў, у нелегальным продажы спіртных напіткаў, тытуню і медыкаментаў, у самавольнай высечцы лесу, патраве пасеваў і зборы галля, абразе асобы, а таксама справы аб устанаўленні права ўласнасці на рухомую і нерухомую маёмасць, аб спагнанні даўгоў, аб прызначэнні апекуноў над непаўналетнімі.

Шматлікія цыркуляры, распараджэнні, загады міністэрства ўнутраных спраў Польшчы, Палескага ваяводскага ўпраўлення, Галоўнай, Палескай ваяводскай і Брэсцкай павятовай камендатур дзяржаўнай паліцыі, пратаколы сходаў камендантаў пастарункаў, следчыя справы, статыстычныя звесткі аб крымінальных злачынствах, справаздачы аб грамадска-палітычным руху на тэрыторыі Брэсцкага павета, характарыстыкі палітычных поглядаў і маральнай устойлівасці грамадзян, духавенства і іншую інфармацыю можна знайсці ў фондзе 93 "Брестская поветовая комендатура государственной полиции Полесской окружной комендатуры (з 1924 г. – Полесской воеводской комендатуры) государственной полиции министерства внутренних дел Польши, г. Брест Брестского округа (з 1921 г. – Полесского воеводства)".

Шматлікім з'яўляецца фонд 94 "Пружанская поветовая комендатура государственной полиции" – 2840 спраў. Сярод іх – цыркуляры, распараджэнні, загады Галоўнай, Палескай ваяводскай і Пружанскай павятовай камендатур дзяржаўнай паліцыі, пратаколы агульных сходаў камендантаў пастарункаў Пружанскага павета, інфармацыйныя паведамленні, справаздачы, данясенні паліцэйскіх аб грамадска-палітычным руху, пра забастоўкі, аб барацьбе з крымінальнымі злачынствамі, следчыя справы, пратаколы допытаў і інш. У вопісе 2 гэтага фонда ёсць дакументы паліцэйскіх пастарункаў на тэрыторыі Пружанскага павета, а ў вопісе 3 – дакументы следчага аддзела Пружанскай павятовай камендатуры дзяржаўнай паліцыі. У фондзе 100 "Пружанская тюрьма" (2739 адзінак захоўвання) знаходзяцца цыркуляры, распараджэнні міністэрства юстыцыі Польшчы, статыстычныя звесткі аб колькасці, руху зняволеных, справы

выкананых і інш. У асабовым фондзе пружанскага натарыуса Уладзіслава Кавалеўскага (фонд 89) за 1920–1932 гг. змешчаны распараджэнні Гродзенскага акруговага суда, натарыяльныя акты, рэперторыум, рэестры апратэставаных вэксаляў, алфавітныя паказальнікі, копіі пасведчанняў адвакатаў на права дзейнасці, завераныя натарыусам.

Цікавыя звесткі аб падаткаабкладанні, маёмасных правах жыхароў Пружаншчыны змяшчае фонд 361 “Пружанское казённое правление Брестской казённой палаты”, якое ўключае пратаколы пасяджэнняў Пружанскага казённага праўлення, журналы ўліку прыходаў і расходаў, заявы грамадзян аб аднаўленні ў правах уласнасці, аб выдачы падатковых ільгот. Падобная інфармацыя аб Косаўскім павеце ёсць у фондзе 362 “Коссовское казённое правление Брестской казённой палаты”. Пружанскі кааператыўны банк (фонд 603) прадстаўлены ўсяго адзінкавай справай, дзе змешчаны пратаколы агульных сходаў членаў банка за 1928–1930 гг.

Аб памерах урону жыхароў у час Першай сусветнай вайны і аб пасляваенным аднаўленні часткова можна высветліць у дакументах фонда 54 “Оценочная комиссия по учёту ущерба, причинённого в годы Первой мировой войны населению г. Бреста и Брестского повета” і фонд 371 “Брестское поветовое бюро по восстановлению хозяйств, разрушенных в годы Первой мировой войны”.

Для вывучэння становішча сельскай гаспадаркі Белавежскага рэгіёну вельмі карыснымі з’яўляюцца дакументы фонда 60 “Полесское окружное земельное управление”. У іх утрымліваюцца асабовыя справы служачых, спісы землеўладальнікаў, маёнткаў, якія падвергліся парцэляцыі, вёсак, у якіх праводзілася хутарызацыя сялянскіх гаспадарак, тапаграфічныя планы вёсак і маёнткаў, журналы эксплікацыі, журналы геадэзічных здымак і інш. Не менш каштоўнымі будуць матэрыялы фонда 372 “Поветовые земельные управления Полесского воеводства”. У вопісах 1 і 2 гэтага фонда змешчаны дакументы Брэсцкага павятовага зямельнага ўпраўлення – цыркуляры, распараджэнні, інструкцыі міністэрства сельскай гаспадаркі і зямельных рэформаў Польшчы, Палескага акруговага зямельнага ўпраўлення, справаздачы аб дзейнасці павятовага зямельнага ўпраўлення, бюджэты і фінансавыя справаздачы, справы аб куплі зямлі, ліквідацыі сэрвітутаў, правядзенні парцэляцыі маёнткаў, хутарызацыі зямель, журналы ўліку зямельных участкаў, заявы грамадзян аб выдачы матэрыяльнай дапамогі і пазык, аб куплі зямельных участкаў і прызнанні права на выкуп зямлі, планы і справаздачы аб правядзенні каморніцкіх і землеўпарадкавальных работ, звесткі аб надзяленні зямлёй асаднікаў, статыстычныя звесткі аб памерах зямлі і колькасці землеўладальнікаў, аб колькасці зямельных участкаў, якія былі прызначаны для хутарызацыі, аб стане пасеваў, ураджайнасці, цэнах на сельскагаспадарчую прадукцыю, рэестры абмеру зямлі і інш. Вопіс 5 ўтрымлівае толькі 4 адзінкі захавання Косаўскага павятовага зямельнага ўпраўлення за 1925–1932 гг. – справы аб ліквідацыі сэрвітутаў, правядзенні парцэляцыі маёнткаў, рэестры абмеру зямлі.

Некалькі фондаў ДАБВ змяшчаюць звесткі аб становішчы лясной гаспадаркі. Фонд 1575 “Беловежская государственная дирекция государственных лесов” (20 спраў) ахоплівае схемы надлясніцтваў, карты і планы лесааднаўлення, практычныя работы служачых надлясніцтваў Белавежскай дырэкцыі дзяржаўных лясоў, асабовыя справы і ліссткі служачых лясніцтваў. У фондзе 62 “Брестское

государственное надлесничество" (48 спраў) захоўваюцца цыркуляры, распараджэнні, указанні, інструкцыі міністэрства сельскай гаспадаркі і зямельных рэформаў Польшчы, Белавежскай і Седлецкай дырэкцый дзяржаўных лясоў, пратакол з'езда інспектараў па ахове лясоў, планы развіцця лясной гаспадаркі надлясніцтваў, фінансава-гаспадарчыя планы і справаздачы аб іх выкананні, прэйскуранты цэн на лесаматэрыялы, ведамасці на выдачу зарплаты рабочым і служачым, справаздачы пра пасадку лесу, нарыхтоўку і вываз лесаматэрыялаў, справы аб будаўніцтве і рамонце памяшканняў, тэлефонных ліній, эксплуатацыі і збыце лесаматэрыялаў. У гэтым жа фондзе ёсць 6 спраў за 1937–1939 гг. Мельніцкага надлясніцтва Седлецкай акруговай дырэкцыі дзяржаўных лясоў.

Таксама трэба звярнуць увагу на фонд 597 "Шерешевское государственное надлесничество" (на жаль, усяго 1 справа без даты – звесткі аб стане гаспадаркі Шарашоўскага дзяржаўнага надлясніцтва), фонд 598 "Вядовское государственное надлесничество" (4 справы), фонд 599 "Государственное надлесничество "Бронная Гора" (11 спраў), фонд 600 "Коссовское государственное надлесничество" (6 спраў, у якіх змешчаны план Косава), фонд 602 "Чернянское государственное надлесничество" (6 спраў), фонд 609 "Ивацевичское государственное надлесничество" (6 спраў), фонд 2455 "Белоозёрское государственное надлесничество" (13 спраў, у якіх выкладзена праграма па ачыстцы "Жыроўскага канала" ("Rów Żirowski") 1939 г. і інш.). У іх змешчана інфармацыя аб эксплуатацыі і збыце лесаматэрыялаў, звесткі аб будаўніцтве памяшканняў, вузкакалеек і інш.

Пытанні адукацыі, рэлігійнага жыцця дазволяць раскрыць дакументы фонда 59 "Попечительство Брестского школьного округа (1921–1922 гг. – Делегатура Полесского школьного округа; 1922–1932 гг. – Попечительство Полесского школьного округа)", фонд 310 "Поветовые школьные инспекции Полесского школьного округа (1932–1939 гг. – поветовые школьные инспекции Брестского школьного округа). У фондзе 392 "Пружанская государственная мужская учительская семинария" (69 спраў за 1924–1934 гг.) знаходзяцца цыркуляры і распараджэнні міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы Польшчы, папячыцельства Брэсцкай школьнай акругі, кніга загадаў, пратаколы пасяджэнняў экзаменацыйнай камісіі, педсавета, журналы і табелі паспяховасці навучэнцаў, канспекты ўрокаў, праведзеных вучнямі ў школах, класныя журналы. Там жа ёсць асабовыя справы і спісы настаўнікаў, навучэнцаў. У фондзе 2059 "Полесская православная духовная консистория" сярод разнастайных дакументаў змешчаны асабовыя справы і спісы свяшчэннікаў, царкоўнаслужыцеляў, спісы цэркваў, праваслаўных прыходаў і іх настаяцеляў, свяшчэннікаў, царкоўнаслужыцеляў і інш.

У цэлым, дакументальныя матэрыялы Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці (яны не абмяжоўваюцца названымі фондамі) з'яўляюцца каштоўнымі крыніцамі для вывучэння гісторыі, культуры, рэлігіі Белавежскага рэгёну ў перыяд паміж Першай і Другой сусветнымі войнамі. Значная частка з іх не ўводзілася ў навуковы абарот, чакае кваліфікаванага і аб'ектыўнага даследавання, выкарыстання.